**Цітоў В.С**, *прафесар*

# БЫТ І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСКІХ СЯЛЯН У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

## (паводле матэрыялаў архіва Рускага геаграфічнага таварыства)

Згаданыя матэрыялы ўяўляюць сабой рукапісныя карэспандэнцыі з месцаў, што былі дасланы ў Паўночна-Заходні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

аддзел Рускага геаграфічнага таварыства (РГТ) у Вільню настаўнікамі народных школ, радзей - прыходскімі святарамі. Яны былі напісаны ў пач. 70-х гг. паводле спецыяльнай анкеты, разасланай Рускім геаграфічным таварыствам па паветах і валасцях. Гэтыя лісты ў наш час захоўваюцца ў Рукапісным аддзеле навуковай бібліятэкі Віленскага універсітэта (фонд 34). Яны з'яўляюцца каштоўнейшай крыніцай па вывучэнню гісторыка-культурнай спадчыны беларусаў, рознабакова і рэалістычна раскрываюць паўсядзённы уклад простых працаўнікоў, іх бытавую культуру. Знаёмячыся з імі, дакранаешся да народнага жыцця, адчуваеш каларыт той эпохі.

Апісанні, зробленыя нібы з натуры непрадузятымі сучаснікамі, раскрываюць анатомію сельскай гаспадаркі, яе арганізацыю, матэрыяльную і духоўную культуру. Яны дазваляюць нам па-іншаму паглядзець на эканамічны стан беларускіх сялян пасля адмены прыгоннага права, на іх магчымасці і духоўныя патэнцыялы. Даныя гэтых крыніц разыходзяцца з палітызаванымі пастулатамі аб «забітасці» і «гаротным жыцці» беларусаў да 1917 года. Спрацыраваныя на сучасную эканамічную сітуацыю, яны даюць магчымасць глыбей асэнсаваць наш лёс і магчымыя альтэрнатыўныя шляхі развіцця нашага грамадства.

Значная ўвага ва ўсіх лістах адводзіцца разнастайным прамысловым і сельскагаспадарчым заняткам мясцовых жыхароў (у прыватнасці, земляробству), даюцца важныя звесткі аб культуры гаспадарання, структуры пасяўных плошчаў, ураджайнасці, прыладах працы, народным жыллі і гаспадарчых памяшканнях, сям'і і сямейных адносінах, звычаях, абрадах, вераваннях.

Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых культур складала: жыта - сам-4, аўса і грэчкі - сам-5, проса - сам-5-сам-6. Лішкі збожжа захоўвалі ў грамадскіх свірнах, т.зв. запасных магазінах, вывозілі за межы Беларусі. На Палессі лішкі хлеба нярэдка захоўвалі ў неабмалочаных снапах, якія складвалі на высокіх памостах-адонках. Амаль кожны селянін, паведамлялі мясцовыя карэспандэнты, меў пра запас стажок неабмалочаных снапоў

жыта ў 10-15 коп(у адной капе 60 снапоў), які стаіць у яго 3-5 гадоў, пасля чаго яго расходуюць і ставяць новы.

Мясцовыя жыхары трымалі шмат свойскай жывёлы, больш заможныя - па некалькі дзесяткаў галоў на двор. Важнай падмогай у сялянскай гаспадарцы былі рыбалоўства, пчалярства, збіральніцтва і разнастайныя хатнія рамёствы. Пчалярства было больш развітым ва ўсходняй частцы Палесся. Ім, як адзначаецца ў лістах, займаліся амаль усе сяляне і шляхта; «самы апошні мае не менш пяці вулляў» (Лельчыцкая воласць); у Азарыцкай воласці ў сялян налічвалася 1350 калодных вулляў (на 955 душ мужчынскага насельніцтва); у глухіх лясах Мазырскага павета захавалася борцевае пчалярства. Мноства мёду і воску, а таксама сушанай рыбы, грыбоў, ягад збывалася на мясцовых кірмашах, прадавалася яўрэйскаму насельніцтву ў бліжэйшыя мястэчкі і гарады.

Асобнае месца ў пададзеных лістах займаюць апісанні гаспадарак трох катэгорый сялянства - заможнага, сярэдняга і беднага. На Палессі сацыяльная дыферэнцыяцыя сялянства была менш прыметнай, чым у іншых рэгіёнах. Тым не менш пасля адмены прыгоннага права гэты працэс адчуваўся і тут. Вось, у прыватнасці, дакладнае апісанне дзвюх сялянскіх гаспадарак сяла Буйнавічы Мазырскага павета. Сям'я Якава Сукача ў 14 чалавек (7 мужчын і 7 жанчын) мае 5 жылых пакояў і 16 гаспадарчых пабудоў (свірны, клеці, хлявы, адрыні, гумно і інш.); зямельны надзел - 24 дзесяціны (2 дзесяціны - сядзібны ўчастак, 17 - ворыва, 5 - сенакосы); свойскай жывёлы - 20 валоў, 30 кароў, 60 авечак, 25 свіней. Сапраўдная фермерская гаспадарка, калі не прымаць пад увагу слабую сувязь з рынкам (хлеб, мяса, малако, воўна ішлі ў асноўным на ўласныя патрэбы, з уласнай сыравіны сям'я выраблялa тканіны, шыла для сябе сарочкі, андаракі, світы, кажухі і іншае адзенне). Другая - бедная - гаспадарка Захара Яўрэмы складалася з 4-х членаў сям'і (3 мужчыны, 1 жанчына), мела хату на адзін жылы пакой з курнай печчу, сенцы, свіран, хлеў, гумно; зямельны надзел каля 20 дзесяцін; свойскай жывёлы - 2 валы, карова, 3 свінні, некалькі авечак. Прыкладна тую ж карціну мы назіраем і ў іншых вёсках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пададзеныя краязнаўчыя матэрыялы нераўнамерна асвятляюць культурна-бытавы ўклад розных раёнаў (па асобных вучэбных акругах іх наогул няма), тым не менш яны даюць праўдзівыя звесткі, што не толькі ўдакладняюць нашы веды, але і абвяргаюць старыя догмы савецкай гістарычнай навукі аб стане народнай культуры, вытворчых сілах і духоўных патэнцыялах беларускага сялянства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ